Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

**Предмет аукциона**

**КОМПЛЕКС НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА,**
реализуемый одним лотом, адрес:
Минская обл., г. Слуцк, ул. Комсомольская, 14, 14/1, 14/2, 14/3, 14/4, 14/5, 14/6, 14/8, 14/9, 14/10, 14/11, 14/13, 14/14 14/15, 14/16, общ. пл. всех строений: 17 854 кв. м.

**Состав лота:** 1. **Административное здание** (здание административно-хозяйственное), инв. № **640/С-27076**, общ. пл. 1497,3 кв. м, составные части и принадлежности: три пристройки 2. **Крановая эстакада склада готовой продукции (инв. № 0243)** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С-111025**, общ. пл. 874,2 кв. м, составные части и принадлежности: ворота для закрытия теритрории склада гп (инв. № 0250) Б. 3. **Благоустройство территории** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С-111026**, общ. пл. 0 кв. м, составные части и принадлежности: покрытие проезда к заводоуправлению (инв. № 0235) – А, проезд к заводоуправлению (инв. № 0222)-Б, покрытие проезда и площадки вертикальной (инв. № 0229) – В, ворота въездные центральные (инв. № 0251) – Г, ворота аварийные (инв. № 0252) – Д, железобетонное ограждение (инв. № 0234)-Е, композиция рабочий (инв. № 0239) – Ж, декоративный забор (инв. № 203551) – И, ворота выездные (инв. № 0249) – К. 4. **Здание гаража** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27083**, общ. пл. 202 кв. м. 5. **Гараж и пристройка** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27078**, общ. пл. 142,1 кв. м, составные части и принадлежности: А2/к двухэтажное, кирпичное, здание гаража, бытовки, а-забора. 6. **Здание механического участка** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27081**, общ. пл. 1538,6 кв. м, составные части и принадлежности: медпункт, бытовка. 7. **Котельная** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27100**, общ. пл. 185,6 кв. м. 8. **Эмальцех с ПРУ** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27105**, общ. пл. 2238,1 кв. м, составные части и принадлежности: одноэтажное, кирпичное, здание эмальцеха с подвалом, забором а, забором б, воротами в. 9. **Здание материального склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. № **640/С-27095**, общ. пл. 1026,8 кв. м. 10. **Здание проходной** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27091**, общ. пл. 111,1 кв. м. 11. **Здание электроцеха** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27088**, общ. пл. 339,4 кв. м. 12. **Пожарное депо** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С- 27086**, общ. пл. 114,8 кв. м. 13. **Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ**, инв. № **640/С-27085**, общ. пл. 1155,3 кв. м. 14. **Здание специализированное иного назначения,** инв. № **640/С-27092**, общ. пл. 3460,2 кв. м, составные части и принадлежности: одноэтажное, панельно-кирпичное здание эмалировачного цеха с бытовками. 15. **Здание компрессорной** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27103**, общ. пл. 254,1 кв. м. 16. **Здание гаража** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27084**, общ. пл. 358 кв. м. 17. **Здание литейного цеха** (здание специализированное иного назначения), инв. № **640/С-27102**, общ. пл. 3409,2 кв. м. 18. **Канализация от з-да к горкот. (инв. № 0307),** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. № **640/С-113729**, общ. пл. 0 кв. м, составные части и принадлежности: канализация от з-да к горкот. (инв.№0307), протяженностью 169,0 м. 19. **Канализация внутриплощ. (инв. № 0308)** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. № **640/С-113728**, общ. пл. 0 кв. м, составные части и принадлежности: канализация внутриплощ. (инв. № 0308) А1, протяженностью 89,8 м. 20. **Высоковольтная кабельная трасса,** инв. № по бух. учету 325. 21. **Пожарный резервуар** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С-85673**, общ. пл. 0 кв. м. 22. **Эстакада шихтового двора (инв. № 0221)** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С-111024**, общ. пл. 519,3 кв. м. 23. **Эстакада (инв. № 0223.022)** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С-111020**, общ. пл. 267,5 кв. м. 24. **Сооружение н/сети насос (инв. № 0318),** (сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование), инв. № **640/С-111018**, общ. пл. 22,8 кв. м 25. **Эстакада литейного цеха (инв. № 0246)** (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. № **640/С-111019**, общ. пл. 137,6 кв. м. 26. **Градирня** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С-85674**, общ. пл. 0 кв. м. **27. Эстакада мостового крана с бункерами накопительными** (сооружение неустановленного назначения), инв. № **640/С- 85671**, общ. пл. 0 кв. м. Земельный участок общ. пл. 2,9774 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы.

Начальная цена с НДС 20 %: **1 884 437,74 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
**04.07.2023** с **11.00** до **13.00**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.06.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |
| --- | --- |


# ВАБІЦЬ БЕЛЕНЬКІ ПЯСОЧАК ЛЯ РАКІ...

## ПЛЯЖ З ВІДАМ НА СТАРАЖЫТНЫ ПАРК

На галоўным у Гомелі цэнтральным пляжы, які размясціўся на двух з паловай гектарах, — мнагалюдна. Большасць адпачывальнікаў збіраецца каля пяці-шасці гадзін вечара. Многія ўжо купаюцца. На пляжы — шмат падлеткаў і моладзі, менш — бацькоў з маленькімі дзецьмі.

— Перажывалі за наш пляж, калі такая вялікая вада стаяла, — падзялілася гамяльчанка, мама двайнят Святлана.

З дзецьмі апошні тыдзень яна амаль штодня прыходзіць на цэнтральны пляж. Не толькі грэюцца на сонцы, але і гуляюць у «скарбы», кажа жанчына: знаходзяць на пяску і збіраюць у пакет асколкі, дробнае смецце.

— Пакуль што не паспяваюць службы ўсё прыбіраць, таму трэба і самім адпачывальнікам падключацца, — лічыць маладая мама і паказвае на невялікія кучкі смецця, пераважна пластык: яго сабралі наведвальнікі пляжа, каб камунальнікам было лягчэй.

На жаль, пясок на пляжы пакуль недастаткова мяккі і чысты, кажуць і іншыя жанчыны, што прыйшлі сюды з дзецьмі. І дадаюць: вельмі хацелася б, каб падчас падрыхтоўкі зон адпачынку выстаўлялі і папераджальныя таблічкі аб забароне курэння і брыдкаслоўя на пляжы як грамадскім месцы.

Між тым усе апошнія дні на дадзенай тэрыторыі працягвалася работа тэхнікі: завозілі і разраўноўвалі пясок. Месца, дзе працаваў бульдозер, пазначылі папераджальнымі знакамі.

## ЧАКАЮЦЬ ГАСЦЕЙ У РАЁНАХ

Абласному цэнтру на беразе Сожа ўвогуле можна пазайздросціць у плане разнастайнасці вадаёмаў і пляжаў, упісаных у гарадское асяроддзе. У Чыгуначным раёне, у мікрараёне Касцюкоўка і на каскадзе азёраў у Сельмашаўскім мікрараёне пляжы ўжо добраўпарадкаваны. У Цэнтральным раёне горада, дзе размяшчаецца пяць афіцыйных месцаў для купання, завяршаецца падрыхтоўка цэнтральнага гарадскога пляжа, двух пляжаў на каскадзе азёраў па вуліцы Петруся Броўкі, а таксама «Валатоўскага» і «Прудкоўскага». У Савецкім раёне на фінішы падрыхтоўчыя работы на «Любенскім», «Рапоўскім» і двух пляжах у мікрараёне Шведская Горка.

Новенькі пляж у межах масаваў жыллёвай забудовы ў мікрараёне Шведская Горка, дарэчы, падчас паводкі быў моцна затоплены: пад вадой аказалася ўся інфраструктура. Тым не менш, і гэты пляж афіцыйна адкрыты з 1 мая і ўжо прымае адпачывальнікаў. Выпрабаванне вялікай вадой добра перанеслі лаўкі, драўляныя канструкцыі дзіцячага гарадка. Пасля разводдзя спатрэбілася падсыпка пяску. Купаюцца на пляжы пакуль адзінкі, але ўжо нясуць дзяжурства супрацоўнікі Таварыства выратавання на водах. У хуткім часе тут будзе арганізавана зона купання для дзяцей.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



## НА КАНТРОЛІ ГУБЕРНАТАРА

Напярэдадні купальнага сезона ў Гомельскай вобласці праводзіцца вадалазнае абследаванне і ачыстка ад старонніх прадметаў падводнай акваторыі ўсіх пляжаў. Сёлета з-за высокага ўзроўню паводкавых водаў, абследаванне правялі пакуль не на ўсіх тэрыторыях адпачынку. На Прыпяці ў раёне Петрыкава ўзровень вады апусціўся ніжэй за небяспечную адзнаку толькі 19 мая, вада на зніжэнне ідзе вельмі марудна.

Работу па падрыхтоўцы пляжаў рэгіёна да купальнага сезона абмеркавалі на апаратнай нарадзе ў Гомельскім аблвыканкаме.

— Не зацягваць падрыхтоўку пляжаў, каб людзі не ішлі ў непадрыхтаваныя, несанкцыянаваныя месцы, аператыўна стварыць усе неабходныя ўмовы для купальнага сезона, — такую задачу перад усімі адказнымі службамі паставіў **старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО**.

У рэгіёне на патруляванне дзікіх пляжаў ужо выходзяць супрацоўнікі міліцыі. «Улетку патрулі пераразмеркаваны бліжэй да афіцыйных пляжаў, а каля вадаёмаў, забароненых для купання, ужо пачалі работу мабільныя групы, куды ўвайшлі супрацоўнікі міліцыі, прадстаўнікі Таварыства выратавання на водах, МНС і мясцовых выканкамаў. Рэйдавая работа ўключае не толькі распаўсюджванне памятак, інфармацыйных буклетаў, але і, вядома, прафілактычныя гутаркі», — адзначыў **першы намеснік УУС Гомельскага аблвыканкама Анатоль ВАСІЛЬЕЎ**.

Праваахоўнікі нагадалі, што ўжыванне алкагольных напояў у грамадскім месцы або з'яўленне ў стане алкагольнага ап'янення, у тым ліку каля вадаёмаў, пагражае штрафам да 8 базавых велічынь. Купанне ў забароненых месцах караецца штрафам ад адной да трох базавых велічынь.

Толькі за мінулыя выхадныя ў Гомельскай вобласці на нецвярозых адпачывальнікаў каля вады было складзена звыш дзесяці пратаколаў. Усе гэтыя людзі знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Чатыры пратаколы праваахоўнікі склалі за купанне ў недазволеных месцах.

## ПОСТ ПРЫНЯЎ

З першага мая на ўсіх пляжах Гомельшчыны нясуць дзяжурства штатныя супрацоўнікі выратавальных пастоў — гэта 280 чалавек. Акрамя таго, на перыяд купальнага сезона ў рэгіёне задзейнічаюць ад 150 да 200 дадатковых работнікаў — сезонных матросаў-ратавальнікаў. Яны будуць размеркаваны з улікам памераў зон адпачынку і колькасці адпачывальнікаў. Напрыклад, на цэнтральным гомельскім пляжы, які вельмі вялікі па працягласці, будзе задзейнічана на пастах каля дзесяці сезонных матросаў-ратавальнікаў.

Працягваюць работу ў якасці ратавальнікаў на вадзе і байцы сэрвіснага студэнцкага атрада. Маладыя людзі цяпер заканчваюць вучобу — якраз перад тым, як заступіць на дзяжурства на тэрыторыі цэнтральнай выратавальнай станцыі ў Гомелі.

Ці ёсць рэкамендацыі, калі лепш распачынаць купальны сезон на рэках і азёрах? Адрасуем пытанне **спецыялісту Гомельскай абласной арганізацыі Таварыства выратавання на водах Мікіту ЛІСОЎСКАМУ**.

— Усё залежыць ад фізічнага стану канкрэтнага чалавека. Калі ёсць хранічныя захворванні, праблемы з сэрцам — лепш пачакаць, пакуль вада дастаткова прагрэецца і купацца будзе больш камфортна. Галоўная рэкамендацыя — купацца на афіцыйных пляжах, — падкрэслівае суразмоўнік. — Летась у Гомельскай вобласці падчас купання патанулі дзесяць чалавек. Усе трагічныя здарэнні адбыліся ў забароненых для купання месцах.

У рэгіёне ў бягучым купальным сезоне ўжо зарэгістраваны першы смяротны выпадак. Адбылася трагедыя ў мікрараёне Касцюкоўка Чыгуначнага раёна Гомеля. Побач ёсць добраўпарадкаваны афіцыйны пляж з выратавальным пастом, але група мужчын адпачывала на возеры, у месцы, не прызначаным для купання. У стане алкагольнага ап'янення адзін з кампаніі ў заклад стаў пераплываць вадаём, пачаў тануць. Сведкі здарэння выклікалі ратавальнікаў. Мужчыну выцягнулі, але нягледзячы на ўсе намаганні медыкаў, ім давялося канстатаваць смерць чалавека. На мінулым тыдні купанне ў забароненым месцы ды ў нецвярозым стане ледзь не каштавала жыцця маладой жанчыне. Яе, на шчасце, убачылі з выратавальнай станцыі і паспелі выцягнуць з вады.

— Падчас рэйдаў па тэрыторыі вадаёмаў абавязкова звяртаем увагу на так званыя тарзанкі, прыстасаваныя трампліны, з якіх дзеці, падлеткі могуць скакаць з разгону ў ваду, — звярнуў увагу спецыяліст Гомельскай абласной арганізацыі Таварыства выратавання на водах. — Гэта вельмі небяспечна. Так, на мінулым тыдні адбыўся трагічны выпадак у вёсцы Прыбар Гомельскага раёна. Непаўналетні скокнуў у ваду з «тарзанкі» і атрымаў траўму пазваночніка. Хлопца ледзь паспелі выцягнуць з вады яго сябры — ён ужо не мог рухацца і тануў.

Супрацоўнікі Таварыства выратавання на водах, як засяродзіў увагу Мікіта Лісоўскі, просяць дарослых не ігнараваць закон і не дазваляць дзецям да 14 гадоў адным знаходзіцца на вадаёмах і тым больш купацца. Калі вы сталі сведкам такой сітуацыі, варта абавязкова папярэдзіць ратавальнікаў на варце, ці, калі гэта дзікі пляж, выклікаць супрацоўнікаў міліцыі, каб папярэдзіць трагедыю на вадзе.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**